4. Усачёва, В. В. Колос / В. В. Усачёва // Славянские древности : Этнолингвистический словарь в 5-ти томах / под общ. Ред. Н. И. Толстого. – Т. 2 : Д – К (Крошки), – М. : Междунар. отношения, 1999. – С. 552–556.
5. Первые “Дожинки” [Электронный ресурс]. – Режим доступа http://25.by/1996/dozhinki
6. Дожинки: от обряда к современному празднику [Электронный ресурс]. – Режим доступа https://peskiadmin.ru/scenarii-prazdnichnogo-gulyaniya-gulyai-lyudi-veselei-samovaru.html

Сипайло Т.К., студент 150 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Бомбешко И.И.,
кандидат культурологии, доцент кафедры

## ГЕНРЫХ ХРЫСТАФОРАВІЧ ТАТУР ЯК АРХЕОЛАГ, КРАЯЗНАВЕЦ, КАЛЕКЦЫЯНЕР

З гісторыяй горада Мінска звязана шмат знакавых імён, адно з іх – археолаг, краязнавец і калекцыянер Генрых Хрыстафоравіч (па іншых крыніцах – Хразастомавіч) Татур, на якім мы падрабязна засяродзім нашу ўвагу. Г. Х. Татур нарадзіўся ў Слоніме 17 верасня 1846 г. у сям’і Хрызастома-Лаўрэнція-Даменіка Іванава Татура, маршалка Слонімскага павятовага дваранства. Інфармацыя аб маці Г. Х. Татура вельмі сціслая. У Дзяржаўным гістарычным архіве Літвы захоўваецца ліст 1884 г. з узгадваннем маці даследчыка Ганны, якая пэўны час навучалася ў жаночым пансіёне ў Варшаве [16]. На жаль, фатаграфічныя выявы Г. Х. Татура даследчыкамі пакуль не выяўлены, вядома толькі моўнае апісанне яго знешнасці.

Асоба Г. Х. Татура заўжды была прыцягальнай для даследчыкай беларускай гісторыі, археалогіі, краязнаўства, музейнай справы. Яго дзейнасці ў згаданых сферах прысвяцілі свае працы вядомыя беларускія навукоўцы Л. В. Аляксееў [1, 2, 3], А. А. Гужалоўскі [5], Д. І. Даўгяла [6] і інш. Аднак, нягледзячы на пэўную колькасць публікацый, жыццё і разнапланавая дзейнасць Г. Х. Татура па-ранейшаму выклікаюць у даследчыкаў цікавасць, а яго асоба застаецца загадкавай і прыцягальнай.

Мы засяродзім нашу ўвагу на калекцыянерскай і музейнай дзейнасці Г. Х. Татура. Па звестках вядомага айчыннага гісторыка і археолага Л. В. Аляксеева, Г. Х.Татур зацікавіўся старажытнасцямі і іх калекцыяніраваннем ў 14-цігадовым узросце, затым прыйшоў інтарэс і да археалогіі [2, с. 88]. З'яўляючыся сябрам Мінскага губернскага статыстычнага камітэта, Г. Х. Татур змог арганізаваць з 1874 г. уласныя археалагічныя даследаванні ў Мінскай губерні, па выніках якіх падрыхтаваў і выдаў некалькі прац («Археалагічнае значэнне Мінскай губерні», «Нарысы археалагічных помнікаў на прасторы Мінскай губерні і яе археалагічнага значэння»). Некалькі з яго прац засталіся ў рукапісах [8, с. 178]. Акрамя таго у выніку археалагічных даследаванняў археолаг змог скласці археалагічную карту Мінскай губерніі з апісаннем помнікаў. Яго археалагічная калекцыя значна папоўнілася за кошт матэрыялаў, выяўленых пад час курганных раскопак, якія актыўна праводзіў са Г. Х. Татур на тэрыторыі Мінскай губерніі ў 1870-90-я гг. [5, с. 38].

Нягледзячы на сваё каталіцкае веравызнанне, Г. Х. Татур атрымаў у Свяшчэнным Сінодзе Адкрыты ліст на аказанне садзейнічання ў працы па "царкоўнай археалогіі". З дапамогай такога дазволу ён абследаваў беларускія праваслаўных цэрквы і манастыры з мэтай збору старажытных культавых прадметаў. Такім чынам яго збор папоўніўся мноствам каштоўных і цікавых помнікаў [11, с. 90-91]. Шмат каштоўных прадметаў гісторыка-пабытовага

характару і твораў мастацтва перайшло да Г. Х. Татура з магнацкіх родаў у выніку ламбардных аперацый [5, с. 38].

У пачатку XX ст. для размяшчэння ўжо вельмі значнага збору гаспадаром было адведзена два драўляныя будынкі на ўскраіне Мінска, у адным з якіх захоўваліся карціны і абразы, а ў другі – гісторыка-археалагічная калекцыя і бібліятэка. Беларускі даследчык Ю. А. Піскун сцвярджае, што зборы Г. Х. Татура былі практычна недаступныя для наведвальнікаў [15, с. 11]. Вядомы філолаг і папулярызатар фатаграфічнай справы В. І. Сразнеўскі, які агледзеў збор у 1907 г., ахарактарызаваў яго “як разнастайны”. Сярод убачанага вылучаліся “... вынікі раскопак курганоў (касцякі, каменныя прылады, розныя ўпрыгожванні); стражытна-польскія даспехі і зброя (напрыклад, лук С. А. Панятоўскага, шлем эпохі 30-гадовай вайны, парахаўніца 1641 г. з інкрустацыяй на скуры, велізарны рыцар на кані, закаваны з панцыр з гербам Радзівілаў на грудзях; сцягі ; шырокі збор анцімінсаў, царкоўнае начынне, адзенне, крыж, ахвяраваны Жыгімонтам I Лагойскаму касцёлу, калекцыі слуцкіх паясоў і тканін, манет, посуду, гузікаў, марак і інш.) [6, с. 553]. Вельмі каштоўныя выданні кніг XVI – XIX стст. захоўваліся ў бібліятэцы. Сярод рарытэтаў: “Біблія” выдання Ф. Скарыны, III Статут ВКЛ 1588 г., кнігі з нясвіжскай бібліятэкі Радзівілаў. Асобныя крыніцы сведчаць, што больш за 30 гадоў ён сабраў каля 6500 тамоў і рукапісаў XIV-XIX стст., звесткі пра якія трапялі ў агульнарасійскія даведнікі бібліяфілаў [10, с. 67; 14, с. 116; 19, с. 108]. Што тычыцца бібліятэкі, то яна прысвечана была пераважна Беларусі, і толькі часткова, па неабходнасці, Польшчы.

Як і многія тагачасныя калекцыянеры, Г. Х. Татур цікавіўся і нумізматыкай. Па сведчанні даследчыкаў, у нумізматычнай калекцыі каклекцыянера захоўваліся манеты Літвы, Польшчы і звязаных з імі тэрыторый. Храналагічныя межы дадзенай калекцыі,ахопліваюць перыяд кіравання вялікага князя Аляксандра (1492-1506) і Варшаўскае княства.

Самая раняя манета ў зборы – паўгрош ВКЛ князя Аляксандра, а самай позняй – грош і двухзлотавая манета (1/3 талента) 1814 года [4].

Г. Х. Татур рабіў спробы выкарыстоўваць сабранае ў навуковых і асветніцкіх мэтах. Так, на аснове сваёй археалагічнай калекцыі ён падрыхтаваў некалькі прац, аб якіх мы ўжо згадвалі. Сабраныя матэрыялы дазволілі яму ў 1883 г. правесці археалагічную выстаўку ў Мінску [17, с. 518]. У 1893 г. Г. Х. Татур стаў адным з экспанентаў выстаўкі. што была прымеркавана да адкрыццы IX Археалагічнага з’езда [7, с. 8].

Трэба адзначыць, што збіральніцкая, як урэшце і археалагічная дзейнасць Г. Х. Татура рэзка крытыкавалася яго сучаснікамі. Апантанасць калекцыянера, а таксама зацікаўленасць беларускімі старажытнасцямі спалучалася ў ім з дылетантызмам у навуцы, які ўзмацняўся рознымі гандлёвымі аперацыямі. Непапраўныя страты археалаогіі прынеслі яго хаатычныя курганныя раскопкі, прычым шмат чаго са знойдзенага бясследна знікла.

Пасля смерці Г. Х. Татура ў 1907 г. справа яго жыцця засталася незавершанай: ён не паспеў правесці ўпарадкаванне збораў, музейную сістэматызацыю сабранай ім вялікай калекцыі беларускіх старажытнасцей, якую ён пачаў рабіць незадоўга да сваёй смерці. Прыведзены ў парадак аказаліся толькі карціны і абразы. Г. Х. Татур не пакінуў нашчадкаў, і ўвесь яго збор, ацэнены ў 200 тыс. рублёў, паступіў у продаж. Спрабуючы захаваць яго для горада, супрацоўнік Мінскага царкоўна-археалагічнага музея Д. В. Скрынчанка безвынікова звяртаўся па дапамогу ў мясцовыя інстанцыі. Не прынеслі поспехаў яго звароты і да прызнаных расійскіх аўтарытэтаў – П. С. Уваравай, С. І. Шчукіну, І. Е. Забеліну [13, с. 6].

У 1907 г. удава збіральніка перадала Мінскаму епіскапу цудадзейны абраз Божай Маці, які быў ўрачыста перанесены ў тым жа годзе ў лагойскую царкву (далейшы яго лёс невядомы). Збор старажытных манускрыптаў і рукапісаў XVI – XVIII стст. і старадрукаў па хадайніцтву акадэміка

А. Шахматава планавала набыць Расійская АН [15, с. 11]. На спецыяльным пасяджэнні было прынята пастанова аб выдзяленні адной тысячы рублёў на набыццё збору Г. Х. Татура. Аднак пастанова не была выканана, паколькі стала вядомы, што частку збора Г. Х. Татура (невядома толькі, што канкрэтна: рукапісы і кнігі. ці і рэчавыя помнікі) набыта графам Тышкевічам, які набыў яго быццам бы для Віленскага музея мастацтва і навук, а да таго моманту размясціў гэту калекцыю ў сваім маёнтку Чырвоны Двор каля Вільні [15, с. 12].

У выніку большая частка збору была набыта прадстаўніком ствараемага ў той час Віленскага музея мастацтва, які так і не быў створаны, пасля чаго сляды яго губляюцца. Другая частка была набыта пры пасрэдніцтве І. І. Луцкевіча и прафесара-славіста І. Свяцінскага заснавальнікам Нацыянальнага музея ў Львове мітрапалітам А. Шаптыцкім [5, с. 38; 12, с. 68-69]

## СПІС ВЫКАРАСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Алексеев, Л. В. Археология и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е гг. XX в. / Л. В. Алексеев ; под ред. Б. А. Рыбакова. – Минск : Беларус. навука, 1996. – 206 с.

2. Алексеев, Л. В. Белорусская археология и историческоекраеведение во второй половине XIX – начале XX в. / Л. В. Алексеев // Совет. археология. – 1968. – № 3. – С. 85–101.

3. Алексеев, Л. В. Очерк истории белорусской дореволюционной археологии и исторического краеведения до 60-х гг. XIX в. / Л. В. Алексеев // Совет. археология. – 1967. – № 4. – С. 146–164.

4. Грималаускайте, Д. Неизвестная коллекция XIX века / Д. Грималаускайте // Studia numismatica albaruthenica : зборнік навуковых артыкулаў / [укладальнікі: В. М. Сідаровіч, М. А. Плавінскі. – Мінск, 2011. – Vol. 1. – С. 134–164.

5. Гужалоўскі, А. Нараджэнне беларускага музея / А. Гужалоўскі. – Мінск : Нац. арх. Рэсп. Беларусь, 2001. – 123 с.

6. Даўгяла, З. І. Матэрыялы аб музеі Г. Х. Татура ў Мінску / З. І. Даўгяла // Запіскі аддзелу гуманітарных навук БАН. Працы класа гісторыі. – Минск, 1929. – Кн. 8. – Т. 3. – С. 553-556.

7. Девятый археологический съезд в Вильне / составил А. П. Смородский. – Минск : Минский губернский статистический комитет, 1893. – 85 с.

8. Дзярновіч, А. Мінскі антыквар і археолаг Генрых Татур ва ўспамінах і ліставанні / А. Дзярновіч // Знакамітыя мінчане XIX—XX стст. Вып. 6: Мінск і мінчане ў літаратурных творах на рубяжы XIX—XX стст. / Інстытут Польскі ў Мінску. – Мінск, 2011. – С. 178–183.

9. Дзярновіч, А. І. Антыквар і археолаг Генрых Татур і мінскі рынак антыкварыяту ў канцы XIX — пачатку XX ст. / А. І. Дзярновіч // Ельскія чытанні : матэрыялы канферэнцыі “Шляхецкая культура Беларусі XIX — пачатку XX ст.” (Дудуткі, 27 красавіка 2013 года) / [укладанне Д. Ільініч. — Мінск, 2013. — С. 183—191.

10. Доўнар, Л.І. Мінскія кнігазборы XIX стагоддзя / Л. І. Доўнар // Здабыткі : дакум. помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі ; склад. Л. Г. Кірухіна, Т. І. Рошчына. – Мінск, 1998. – Вып. 3. – С. 60-72.

11. Красавицкий, И. Памятники церковной старины Полоцко-Витебского края и их охранение / И. Красавицкий // Полоцко-Витебская старина / издание Витебской ученой архивной комиссии. – Витебск, 1911. – Кн. 1. – С. 50-121.

12. Мальдис, А. Белорусские сокровища за рубежом / А. Мальдис. – Минск: Література і Мастацтва, 2009. – 208 с.:

13. Минская старина: труды Минского церковного историко-археологического комитета. Вып. 1 / под редакцией хранителя музея Д. Скрынченко. – Минск : Типография С. А. Некрасова, 1909. – 167, [1] с.

14. Параделов, М. Я. Адресная книга русских библиофилов и собирателей гравюр, литографий, лубков и прочих произведений печати / составил М. Я. Параделов. – М. : Антикварного книжного отделения при магазине древностей и редкостей М. Я. Параделова, 1904. - [2], II, 180 с.
15. Піскун, Ю. Лёс збораў Генрыха Татура / Ю. Піскун // Вяртанне-2 : Зб. арт., дакументаў і арх. матэрыялаў па прабл. пошукаў і вяртання нац. каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэсп. Беларусь / Беларус. фонд культуры і інш.; [Склад.: А. Тоўсцік, М. Яніцкая; Прадм. да арт. М. Яніцкай]. - Мінск, 1994. – С. 10-19.
16. Рублевская, Л. Матар'ялы аб музэі Г. Х. Татура ў Менску [Электронны рэсурс] / Л. Рублевская // Савецкая Беларусь. – Рэжым доступу: https://www.sb.by/articles/ocharovannyy-khranitel-drevnostey.html. - Дата доступу: 22.03.2022.
17. Случевский, К. К. По Северо-Западу России: В 2-х т. – С.-Петербург : А. Ф. Маркса, 1897. – Т.2: По Западу России : С картою зап. края, отпечат. в 6 красок и 159 рис. – 608, XII с.
18. Сцецкевіч-Чабаганаў, А. В. Я – сын Ваш : Некрашэвічы герба «Любіч». Татуры герба «Данброва». Сеўрукі герба «Курч». Кернажыцкія герба «Юноша». Маствіловічы герба «Даленга» / А. Статкевіч-Чабаганаў. – Мінск : Роднае слова, 2012. – 592 с.
19. Шуманский, Е. А. Справочная книга для русских библиофилов и коллекционеров / составил Е. А. Шуманский. – Одесса, 1905. – XVII, [1], 203, [4] с.

Смаркович А.В., студент 108 группы
дневной формы обучения
Научный руководитель – Гончарик Н.Г.,
старший преподаватель